*ВЕСТКІ З ПРАКТЫКІ*

# У ЛЕТНІХ ЭКСПЕДЫЦЫЯХ

Навукова-даследчая работа — вельмі важны раздзел праграмы падрыхтоўкі спецыяліста-біёлага. Яе значэнне вызначаецца тым, што яснае ўяўленне аб акаляючай нас прыродзе можна атрымаць толькі супастаўляючы тэарэтычныя веды, набытыя ў працэсе акадэмічных заняткаў, з непасрэднымі назіраннямі ў натуральнай абстаноўцы. Толькі такім шляхам можна зразумець складаныя з'явы прыроды і іх узаемасувязі і ўзаемазалежнасці, правільна ацаніць экасістэмную ролю і народнагаспадарчае значэнне кожнага жывога арганізма. Без набыцця разнастайных навыкаў і вопыту эксперыментальнай і палявой работы, без засваення комплексу метадычных прыёмаў збору зыходных біялагічных матэрыялаў і іх наступнага аналізу нельга стаць сапраўдным біёлагам або выкладчыкам прыродазнаўства. Асабліва важна гэта цяпер, у перыяд агульнай экалагізацыі чалавечай дзейнасці і пошукаў прынцыпаў рацыяналізацыі выкарыстання прыродных рэсурсаў. Аднак значэнне НДРС нельга зводзіць толькі да вучэбнага аспекта. У працэсе работы над індывідуальнай тэмай кожны студэнт выконвае няхай не вялікае па аб'ёму, але самастойнае навуковае даследаванне і папаўняе новымі данымі нашы ўсё яшчэ недастатковыя веды аб акаляючым асяроддзі. Гэта накладвае асаблівую адказнасць за выбар тэматыкі НДРС, яе актуальнасць, магчымасць выкарыстання ў народнай гаспадарцы.

Кафедрай заалогіі і дарвінізму ўжо на працягу шэрагу год праводзіцца вывучэнне розных форм антрапагеннага ўздзеяння, у першую чаргу меліярацыі, на прыродныя біяцэнозы. У гэтым жа напрамку праводзіцца і ўся без выключэння даследчая работа студэнтаў. Мэтанакіраваныя намаганні студэнтаў і супрацоўнікаў кафедры дазволілі накапіць вялікі і цікавы навуковы матэрыял і часткова абагуліць яго. Па раздзелу наземных пазваночных, у прыватнасці, удалося выявіць асноўныя экасістэмныя зрухі ў іх суполлі на меліярыраваных угоддзях і высветліць унутраныя механізмы гэтых зрухаў. Удзельная вага студэнцкіх распрацовак у гэтых даследаваннях вельмі вялікая.

Студэнты і супрацоўнікі кафедры ў бягучым годзе праводзілі даследаванні на двух стацыянарах: «Гогалі» у Рэчыцкім раёне і «Чонкі» у ваколіцах Гомеля. Тут, у асноўным, вывучалася ўздзеянне на жывёльны свет рэкрэацыі і іншых фактараў, звязаных з чалавечай дзейнасцю, у першую чаргу, канешне, як і заўсёды, меліярацыі.

Вельмі вялікую навуковую цікавасць маюць атрыманыя пры ўдзеле групы студэнтаў завочнага факультэта В. Яўсеенкі і іншых матэрыялы аб забруджванні вады і берагоў меліярацыйных каналаў астаткавай колькасцю хлараргранічных пестыцыдаў, такіх як ДДТ, хларафос, гексахларан і інш.

Каштоўнасць маюць і работы па вывучэнню самаачышчэння вод каналаў і іншых вадаёмаў, выконваемыя студэнтамі стацыянара і завочнага факультэта пад кіраўніцтвам в. а. дацэнта І. Ф. Расашко. Гэтыя даследаванні вядуцца ўжо шмат гадоў. Іх вынікі публікаваліся ва ўсесаюзных часопісах, дакладваліся на буйных з'ездах і нарадах гідрабіёлагаў.

Акрамя правядзення работы на стацыянарах, сёлета студэнты ўдзельнічалі ў двух маршрутных экспедыцыях. Адна з іх працавала на Чаграйскім водасховішчы ў Перадкаўказзі, дзе вывучаліся заканамернасці фарміравання іхціяфаўны, змяненне марфалогіі рыб ва ўмовах замкнутага басейна. Другая экспедыцыя праводзіла даследаванні ў сярэднім цячэнні Дняпра. У ёй прымалі ўдзел студэнты-чацвёртакурснікі С. Філіпенкаў, М. Мохараў і пяцікурсніца завочнага факультэта А. Лятчэня. У ходзе гэтай экспедыцыі сабраны багаты шматабяцаючы матэрыял у вусці р. Бярэзіны на двух буйнейшых асушаных масівах у пойме Дняпра. Цяпер праводзіцца камеральная апрацоўка сабраных даных.

**Я. ПАДУТАЎ,**
**дацэнт кафедры заалогіі і дарвінізму.**

*РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА-81*

# УСПАМІН ЗАСТАНЕЦЦА НАДОЎГА

Тады праца спорыцца, калі людзі добра разумеюць адзін аднаго, калі ў калектыве пануе ўзаемаразуменне і дружба. Гэта старая ісціна, але прыходзіць да яе кожны праз свой уласны вопыт. Вось і я, працуючы з аднымі і тымі ж дзяўчатамі некалькі гадоў запар, зразумела: станаўленне калектыву, а разам з ім і поспех, прыходзяць не адразу. Тры сезоны адпрацавалі мы ў саўгасе «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна на ўборцы садавіны і гародніны. Мясцовасць, умовы працы і жылля добра вядомыя, а трэба сказаць, што рыхтуюцца да сустрэчы студэнтаў у Ціхінічах (так называецца і цэнтральная сядзіба гаспадаркі) загадзя і старанна. Там нават пабудаваны спецыяльны студэнцкі гарадок, добраўпарадкаваны, зручна прыстасаваны для жылля ў час сельскагаспадарчых работ.

Вось і ў гэтым годзе там змаглі размясціць чатыры атрады — тры з нашага універсітэта і адзін з Рагачоўскага медыцынскага вучылішча. Убіралі агуркі, памідоры, цыбулю, яблыкі. Дзяўчаты так стараліся працаваць, што некаторым удавалася выконваць амаль што па тры нормы. Мяркуйце самі: напрыклад, агуркоў неабходна сабраць за дзень 72 кілаграмы, а Наталля Таранава, Таццяна Валешчык, Люда Леўчанка, Валянціна Калюшка, Святлана Багдановіч, Святлана Краўчанка, Ала Семаненка, Аляксандра Арэхава збіралі больш за 200.

Нягледзячы на стому дзяўчат, атраднае жыццё не замірала і ўвечары. Надоўга запамятаецца фестываль які прайшоў 9 жніўня. Рыхтаваліся ўсе чатыры атрады. Выбралі камісію для распрацоўкі праграмы. І фестываль удаўся на славу. Шмат хвалявання прынеслі спартыўныя спаборніцтвы: кожны «хварэў» за сваю каманду. А самую вялікую аўдыторыю сабраў конкурс цырульнікаў. Усе ж чатыры атрады дзявочыя! Прычым у конкурсе ўдзельнічалі не толькі цырульнікі, журы, але і гледачы. Іх думка наконт кожнай прычоскі была галоўнай. Нават медалі па выніках конкурсу прысуджалі. І наогул конкурс гэты ператвараўся ў своеасаблівы канцэрт, таму што кожнаму віду прычоскі павінен быў адпавядаць касцюм, а потым, у час абароны яе перад журы і гледачамі, і нумар мастацкай самадзейнасці.

Супрацоўнічалі мы і з мясцовай моладдзю, з іх камсамольскай арганізацыяй: праводзілі агульныя камсамольскія сходы, выпускалі выпускі «Камсамольскага пражэктара» і насценгазеты «Молодость». 11 жніўня прайшоў агульны камсамольскі сход «Імя XXVI з'езда КПСС — будзьце дастойнымі!».

У клубе саўгаса праходзілі вечары адпачынку. Пачыналіся яны звычайна лекцыяй. Тэматыка лекцый была самай разнастайнай: гісторыя нашага краю, пытанні этыкету, медыцына, ахова прыроды, правільнае і рацыянальнае выкарыстанне лекавых раслін.

Адбыліся сустрэчы з ветэранамі вайны. У адзін з выхадных дзён мы прайшлі па месцах баявой славы былога падпольнага райкома партыі Рагачоўскага раёна.

Успамін аб гэтых летніх месяцах застанецца надоўга ў нашай памяці, тым больш, што для многіх з нас гэта была апошняя такая паездка — напярэдадні пятага курс.

*Галіна* **КАЧМАРОВА,**
**студэнтка чацвёртага курса біялагічнага факультэта.**

# У ВОСТРАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

Ардэнаноснаму Гомелю выпаў гонар праводзіць Усесаюзную спартакіяду спартыўных клубаў ВНУ па веславанню на байдарках і каноэ. За прызавыя месцы змагаліся мацнейшыя весляры 36 вышэйшых навучальных устаноў васьмі саюзных рэспублік, гарадоў Масквы і Ленінграда. У камандным заліку першынство заваявалі весляры Цэнтральнага ордэна Леніна інстытута фізічнай культуры. Яны набралі 340 ачкоў. Пасляхова выступілі выхаванцы ГДУ (трэнеры У. Паўлючкоў, С. Сямёнаў). У скарбонку каманднага заліку яны ўнеслі 283,5 ачка і занялі другое месца. Толькі на тры ачкі адсталі весляры Херсонскага педагагічнага інстытута, якія ў камандным заліку аказаліся трэцімі.

Сярод рэспублік перамаглі весляры Украінскай ССР — 677 ачкоў. Спартсмены Беларусі на другім месцы — 501 ачко, на трэцім з 495 ачкамі г. Масква.

Вялікі поспех выпаў на долю нашых весляроў майстроў спорту Аляксандра Манькова і Уладзіміра Зацэпы. Яны выйшлі пераможцамі ў гонках каноэ-двоек на 500 м і заваявалі бронзавыя ўзнагароды на дыстанцыі ўдвая даўжэйшай. Сярэбранага медаля пасля гонак на байдарках-двойках удастоілася студэнтка факультэта фізвыхавання Ганна Котава, якая выступала разам з Ірынай Дзяцяр з Мінскага інстытута культуры.

Дзве медалі дасталося і Васілю Васільцову. У гонках каноэ-адзіночак ён другім перасёк фінішны створ на 500-метровай дыстанцыі і трэцім — на ўдвая даўжэйшай. На гэтых жа дыстанцыях яго таварыш па вучобе Уладзімір Паўлавец заняў адпаведна трэцяе і чацвёртае месцы.

Б. ВАЛОДЗІН.





НА ЗДЫМКАХ: пераможцы спартакіяды А. Манькоў і І. Зацэпа і прызёр спаборніцтваў У. Паўлавец.

Фота У. Чысціка.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Сцяпан Піліпавіч АЖГІРЭЙ**



Пасля цяжкай хваробы, на 77-м годзе жыцця памёр член КПСС з 1928 года, персанальны пенсіянер саюзнага значэння кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі КПСС Гомельскага дзяржаўнага універсітэта Сцяпан Піліпавіч Ажгірэй.

С. П. Ажгірэй нарадзіўся ў 1905 годзе ў сяле Блонь Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і селяніна. Да 20 гадоў працаваў у сельскай гаспадарцы. Далейшая яго працоўная дзейнасць звязана з работай у партыйных і савецкіх органах. З 1929 года ён — прапагандыст Гомельскага акружкома, загадчык культпрападдзела Веткаўскага і Петрыкаўскага райкома партыі, актыўны арганізатар калектывізацыі, а з ліпеня 1933-га — загадчык аддзела культуры і прапаганды ЦК ЛКСМБ.

Пасля заканчэння аспірантуры Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ у 1936 годзе С. П. Ажгірэй на выкладчыцкай рабоце. З 1939 года і ў гады Вялікай Айчыннай вайны — лектар ЦК Кампартыі Беларусі, а з 1944 па 1954-ы — сакратар Баранавіцкага абкома партыі. З 1954 па 1965 гады Сцяпан Піліпавіч працаваў рэктарам Гомельскага педагагічнага інстытута, затым дацэнтам пединстытута і універсітэта. Ён унёс вялікі ўклад у справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для народнай гаспадаркі.

С. П. Ажгірэя вызначала партыйная прынцыповасць, глыбокая тэарэтычная падрыхтоўка, высокае пачуццё абавязку і адказнасці. На ўсіх пастах ён праяўляў вялікія арганізатарскія здольнасці, быў уважлівым да людзей, карыстаўся ўсеагульнай павагай прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад высока ацанілі заслугі С. П. Ажгірэя перад Радзімай. Ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

Светлая памяць аб Сцяпану Піліпавічу Ажгірэю назаўсёды захаваецца ў сэрцах і памяці тых, хто з ім працаваў і ведаў яго.

**Ю. М. ХУСАІНАЎ, А. А. МАЛАФЕЕЎ, Ф. А. ЦЭХАНОВІЧ, С. П. БАБЫР, В. М. ЯКАЎЛЕЎ, А. С. ЛЯХАЎ, У. С. СЦЯПУК, Б. М. ЗБАРОЎСКІ, А. М. ІВАНІСАЎ, Г. М. КУСКОВА, М. У. КРАЎЦОЎ, Б. В. БОКУЦЬ, М. І. СТАРАВОЙТАЎ.**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра гісторыі КПСС глыбока смуткуюць з выпадку смерці дацэнта гэтай кафедры АЖГІРЭЯ Сцяпана Піліпавіча і выказваюць сваё спачуванне родным і блізкім памёршага.**

АЗ 10122

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета ЛКСМБ и профкома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

Заказ 5264.